В. П. Красней

# Беларуская мова ў табліцах і схемах

Для школьнікаў

*8-е выданне*

Мінск • «Аверсэв» • 2020

## Дзеяслоў як часціна мовы

| | |
|---|---|
| **Агульнае граматычнае значэнне** | Абазначае дзеянне ці стан:<br>– фізічнае дзеянне: будаваць, шыць;<br>– рух: ісці, ехаць, бегчы;<br>– адносіны: любіць, паважаць;<br>– стан: спаць, маўчаць, вечарэе |
| **Адказвае на пытанні** | што рабіць? → чытаць, спяваць, радавацца;<br>што зрабіць? → прачытаць, заспяваць |
| **Марфалагічныя прыметы** | Змяняецца па ладах, часах, асобах, ліках, родах (у прошлым часе і ўмоўным ладзе): пайшоў, пайшоў бы, пайдзі; чытаю, чытаў, прачытаю; пішу, пішаш, піша; пішу — пішам; чакаў, чакала. Дзеясловам уласцівы катэгорыі трывання і стану (вывучыў – вучыў; слаўлю працу, праца славіцца) |
| **Сінтаксічная роля** | Асноўная функцыя — роля выказніка: Сінее валошка. Інфінітыў можа з'яўляцца любым членам сказа |

## Формы дзеяслова

| **Асабовыя формы**<br>(што робіць? што рабіў? што зробіць? што рабілі? што будзе рабіць? што зрабіў бы?)<br>**спрагальныя зменныя формы** | | **Неазначальная форма**<br>(што рабіць? што зрабіць?)<br>**неспрагальная нязменная форма** | |
|---|---|---|---|
| чытае<br>чытай<br>чытаў бы | змяняюцца па ладах | хачу чытаць<br>хацеў чытаць<br>хацеў бы чытаць | не змяняецца па ладах |
| чытаем<br>чыталі<br>будзем чытаць | змяняюцца па часах | хочам чытаць<br>хацелі чытаць<br>захочам чытаць | не змяняецца па часах |



© ТДА «Аверсэв»

| Асабовыя формы | |
|---|---|
| чытаю<br>чытаеш<br>чытае | змяняюцца<br>па асобах |
| чытае<br>чытаюць | змяняюцца<br>па ліках |

| Неазначальная форма | |
|---|---|
| хачу чытаць<br>хочаш чытаць<br>хоча чытаць | не змяняецца<br>па асобах |
| хоча чытаць<br>хочуць чытаць | не змяняецца<br>па ліках |

**Дзеепрыметнік**

**неспрагальная зменная форма** (змяняецца па родах, ліках, склонах)

**Дзеепрыслоўе**

**неспрагальная нязменная форма**

• Усім формам дзеяслова характэрны катэгорыі трывання: квітнелі — расквітнелі, квітнець — расквітнець, дзеючы парламент — авеяны славай парламент, чытаючы кнігу — прачытаўшы кнігу.
• Катэгорыя стану ўласціва асабовым формам (Янка чытае кнігу — кніга чытаецца Янкам), дзеепрыметніку (квітнеючы сад — прачытаная кніга), дзеепрыслоўю (толькі форма незалежнага стану: спяваючы песню)

## Безасабовыя дзеясловы

| Значэнне | Марфалагічныя асаблівасці | Сінтаксічная роля |
|---|---|---|
| Выражаюць дзеянне, якое адбываецца як бы стыхійна, само па сабе, без утваральніка, абазначаюць:<br>1) з'явы прыроды: світае, марозіць;<br>2) фізічны і псіхічны стан: нездаровіцца, думаецца;<br>3) магчымасць, неабходнасць: давялося (ехаць), удаецца (зрабіць);<br>4) дзеянне стыхійнай сілы: шанцуе, нясе, цягне (у лес) | Не змяняюцца па асобах, родах, ліках.<br>У абвесным ладзе маюць форму 3-й асобы адзіночнага ліку для цяперашняга і будучага часу (вечарэе, звечарэе), форму ніякага роду для прошлага часу (вечарэла).<br>Могуць мець форму ўмоўнага ладу і інфінітыва: світала б, пачало світаць | Выступаюць у ролі выказніка ў безасабовых сказах: Паволі світала.<br>Пры іх няма і не можа быць дзейніка |



© ТДА «Аверсэв»

# Пераходныя і непераходныя дзеясловы

| Пераходныя | Непераходныя |
|---|---|
| Абазначаюць дзеянне, якое накіравана (пераходзіць) на іншы прадмет, выражаны ў сказе назоўнікам ці займеннікам у форме:<br>1) вінавальнага склону: Чытаў кнігу. Я чытаў яе.<br>2) роднага склону, калі:<br>а) дзеянне накіравана на частку прадмета: выпіў (што?) квас, выпіў (чаго?) квасу;<br>б) пры дзеяслове ёсць адмоўе: чытаў (што?) кнігу, але: не чытаў (чаго?) кнігі | Абазначаюць дзеянне, якое не накіравана (не пераходзіць) на іншы прадмет: ехаць на машыне, адпачываць пасля працы. Пры іх дапаўненні маюць формы ўскосных склонаў, акрамя тых формаў, што ўжываюцца пры пераходных дзеясловах |

# Зваротныя і незваротныя дзеясловы

| Зваротныя | Незваротныя |
|---|---|
| Дзеясловы з постфіксам -ся (-ца, -цца). Абазначаюць дзеянне, накіраванае на сам суб'ект: мыюся (г. зн. мыю сябе), вітаюцца (г. зн. вітаюць адзін аднаго, адзін суб'ект вітае другога), здзіўляцца (стан самога суб'екта), цягнуцца (знешняе дзеянне суб'екта) | Дзеясловы без постфікса -ся (-ца, -цца): працаваць, ісці |
| • Некаторыя дзеясловы могуць быць зваротнымі і незваротнымі: купацца — купаць (каня ў рацэ), мыцца — мыць (посуд), а іншыя — толькі зваротнымі: смяяцца, спадзявацца, ганарыцца.<br>• Усе зваротныя дзеясловы з'яўляюцца непераходнымі | |

# Трыванні дзеяслова

| Трыванні | Маюць формы | | | |
|---|---|---|---|---|
| | неазначальную | цяперашняга часу | прошлага часу | будучага часу |
| Незакончанае | пісаць | пішу | пісаў | буду пісаць |
| Закончанае | напісаць | — | напісаў | напішу |



© ТДА «Аверсэв»

# Утварэнне трыванняў дзеяслова

| Трыванні | Ад чаго ўтвараюцца | Утвараюцца пры дапамозе | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | суфіксаў | прыставак | чаргавання гукаў | змены націску | ад іншых асноў |
| незакончанае трыванне | ад закончанага трывання | звязаць → звязваць<br>атрымаць → атрымліваць<br>параўнаць → параўноўваць | — | стамляць → стаміць | вы́разаць → выраза́ць<br>вы́клікаць → выклі́каць | узяць → браць<br>легчы → класціся |
| закончанае трыванне | ад незакончанага трывання | рашаць → рашыць<br>грукаць → грукнуць | бялець → пабялець<br>рэзаць → адрэзаць | зніжаць → знізіць | адкіда́ць → адкі́даць<br>вымяра́ць → вы́мераць | шукаць → знайсці<br>гаварыць → сказаць |

• Асобныя дзеясловы паслядоўна далучаюць прыстаўкі і суфіксы, утвараючы ступенныя пераходы з аднаго трывання ў другое: біць — абабіць, абабіць — абабіваць, абабіваць — наабабіваць. Такі спосаб называецца ступенным утварэннем трыванняў.

• Некаторыя дзеясловы маюць толькі адну форму трывання: сядзець, існаваць, настаўнічаць, важнічаць (незакончанае трыванне), ачнуцца, пабалаваць (закончанае трыванне). Гэта няпарныя дзеясловы, або аднатрывальныя.

• Некаторыя дзеясловы ў кантэксце могуць выступаць са значэннем як незакончанага, так і закончанага трывання: Няпроста даследаваць архаічныя моўныя з'явы. Здолеў даследаваць архаічныя моўныя з'явы. Такія дзеясловы адносяцца да двухтрывальных

© ТДА «Аверсэв»

# Спражэнне дзеясловаў

**Спражэнне** — гэта змяненне дзеясловаў па асобах і ліках. У залежнасці ад асабовых канчаткаў вылучаюцца два спражэнні.

| Асоба | I спражэнне | | II спражэнне | |
|---|---|---|---|---|
| | адз. л. | мн. л. | адз. л. | мн. л. |
| 1-я | -у (-ю) | -ём (-ом), -ем, -ам | -у (-ю) | -ім (-ым) |
| 2-я | -еш (-эш), -аш | -еце, -аце (-яце) | -іш (-ыш) | -іце (-ыце) |
| 3-я | -е (-э), -а | -уць (-юць) | -іць (-ыць) | -аць (-яць) |

Спражэнні дзеясловаў вызначаюцца па неазначальнай форме

| I спражэнне | II спражэнне |
|---|---|
| 1. Аднаскладовыя дзеясловы на -іць (-ыць): біць, ліць, выць, шыць. | 1. Дзеясловы з інфінітывам на -іць (-ыць) (за выключэннем аднаскладовых): помніць, бяліць, касіць, важыць. |
| 2. Усе іншыя на -аць (-яць), -эць (-ець), -нуць, -ці, -чы | 2. Дзеясловы *гнаць*, *залежаць*, *вярцець*, *цярпець*, *ненавідзець* |

# Рознаспрагальныя дзеясловы

(часткова змяняюцца паводле I і часткова паводле II спражэння)

| Асоба | бегчы | | есці | | даць | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1-я | бягу | бяжым | ем | ядзім | дам | дадзім |
| 2-я | бяжыш | бяжыце | ясі | ясце | дасі | дасце |
| 3-я | бяжыць | бягуць | есць | ядуць | дасць | дадуць |



© ТДА «Аверсэв»

# Лады дзеяслова

Катэгорыя ладу выражае адносіны дзеяння да рэчаіснасці.

| Асаблівасці | Абвесны лад | Умоўны лад | Загадны лад |
|---|---|---|---|
| Значэнне | абазначае дзеянне, якое адбываецца, адбывалася, будзе адбывацца: нашу, насіў, буду насіць | абазначае дзеянне пажаданае ці магчымае, якое адбываецца пры пэўных умовах: насіў бы, насілі б | выражае пабуджэнне да дзеяння, загад, патрабаванне, заклік, параду, просьбу: насі, насіце, шукай, рэж |
| Утварэнне | аснова цяперашняга часу + асабовыя канчаткі<br>вяз-уць + у → вязу,<br>вяз-уць + еш → вязеш,<br>вяз-уць + е → вязе і г. д. | форма прошлага часу + часціца бы (б):<br>м. р. пайшоў + бы → пайшоў бы,<br>ж. р. пайшла + б → пайшла б,<br>н. р. пайшло + б → пайшло б,<br>мн. л. пайшлі + б → пайшлі б | асновы цяперашняга часу + -і, -ы, □:<br>вяз-уць + і → вязі,<br>рэж-уць + □ → рэж□,<br>бяр-уць + ы → бяры,<br>чыта-юць (чытай'-уць) → чытай□;<br>2-я асоба мн. л. — форма 2-й асобы + -це:<br>вязіце, бярыце |
| Маюць формы | часу, асобы, ліку | роду, ліку | асобы, ліку |

**!** Дзеясловы аднаго ладу часам ужываюцца ў значэнні іншага:
- абвеснага — у значэнні загаднага: Едзем на экскурсію! Няхай яны прыедуць.
- умоўнага — у значэнні загаднага: Адпачыў бы ты пасля такой працы.
- загаднага — у значэнні ўмоўнага: Куды ні глянь — усюды кіпіць праца.



© ТДА «Аверсэв»

# Часы дзеясловаў

**Час** — граматычная катэгорыя, якая выражае адносіны дзеяння да моманту гутаркі.

| Цяперашні | Прошлы | Будучы |
|---|---|---|
| дзеянне адбываецца ў момант гутаркі | дзеянне адбывалася ці адбылося да моманту гутаркі | дзеянне адбудзецца пасля моманту гутаркі |
| іду, спяваю, радуюся | ішоў, спяваў, радаваліся | будзем ісці, спяваць, радавацца |

! Акрамя асноўных значэнняў формы часу могуць ужывацца ў іншых значэннях:

- цяперашні час: а) у значэнні прошлага (І часта ў добрую пагоду ідзе Міхал дамоў з абходу.); б) у значэнні будучага (Ты летам ідзеш у паход?);
- будучы: а) у значэнні прошлага (Міхал падыдзе і прыстане, і лаву жыцейка агляне... рукою лёгенька пагладзіць, нібы сынка свайго малога, і ў сэрцы дзякаваў ён Бога.); б) у значэнні цяперашняга (Папрашу захоўваць цішыню.);
- прошлы — у значэнні будучага (Ну, я пайшоў, бо час ужо позні.)

## Змяненне дзеясловаў

| Асоба | Цяперашняга і будучага часу | |
|---|---|---|
| | адзіночны лік | множны лік |
| 1-я | (што раблю?) чытаю, (што зраблю?) пачытаю | (што робім?) чытаем, (што зробім?) пачытаем |
| 2-я | (што робіш?) чытаеш, (што зробіш?) пачытаеш | (што робіце?) чытаеце, (што зробіце?) пачытаеце |
| 3-я | (што робіць?) чытае, (што зробіць?) пачытае | (што робяць?) чытаюць, (што зробяць?) пачытаюць |

| Прошлага часу | |
|---|---|
| адзіночны лік | множны лік |
| м. р.: чытаў□, пачытаў□ | усе роды: чыталі, пачыталі |
| ж. р.: чытала, пачытала | |
| н. р.: чытала, пачытала | |



© ТДА «Аверсэв»

# Станы дзеяслова

**Стан** — граматычная катэгорыя, якая выражае адносіны паміж дзеяннем і суб'ектам дзеяння, а таксама паміж дзеяннем і аб'ектам дзеяння.

| Незалежны стан | Залежны стан |
|---|---|
| Дзеясловы абазначаюць дзеянне, накіраванае на аб'ект. Суб'ект пры дзеясловах незалежнага стану з'яўляецца дзейнікам:<br>Вучні чытаюць кнігу.<br>Да незалежнага стану адносяцца:<br>1) пераходныя дзеясловы: будаваць, любіць, касіць і пад.;<br>2) непераходныя дзеясловы без постфікса -ся: спаць, гандляваць, бегчы, замярзаць, світаць і інш.;<br>3) зваротныя дзеясловы, якія заўсёды ўжываюцца з постфіксам -ся: баяцца, смяяцца | Дзеясловы абазначаюць дзеянне, накіраванае на суб'ект. Суб'ект пры дзеясловах залежнага стану з'яўляецца дапаўненнем:<br>Кніга чытаецца вучнямі.<br>Да залежнага стану адносяцца:<br>1) зваротныя дзеясловы, што ўжываюцца ў пасіўных канструкцыях і спалучаюцца з творным утваральніка дзеяння (суб'екта): карціна пішацца мастаком;<br>2) дзеепрыметнікі, якія спалучаюцца з творным суб'екта: карціна напісана мастаком |

# Правапіс НЕ (НЯ) з дзеясловамі

| Разам | Асобна |
|---|---|
| 1) калі без не (ня) дзеяслоў не ўжываецца: нездаровіцца, непакоіць, няволіць, няможацца;<br>2) у дзеясловах з прыстаўкай неда-, якая абазначае неадпаведнасць патрэбнай норме: недалічваць (мець менш, чым патрэбна), недаважыць (наважыць менш, чым трэба) | У іншых выпадках не пішацца асобна: не бачыў, не бачу |

**!** Дзеясловы з прыстаўкай неда- патрэбна адрозніваць ад дзеясловаў з прыстаўкай да-, якія абазначаюць не даведзенае да канца дзеянне і перад якімі ўжываецца часціца не: не даехаў дадому, не дачытаў пісьмо і да т. п.



© ТДА «Аверсэв»

# Спосабы ўтварэння дзеясловаў

| Спосаб утварэння | Утваральная аснова ці слова | Словаўтваральны сродак | Вытворнае слова |
|---|---|---|---|
| Суфіксальны | абед<br>фінансы | абед + а<br>фінанс + ава(ць) | абедаць<br>фінансаваць |
| Прыставачны (прэфіксальны) | ламаць<br>ляцець | аб + ламаць<br>за + ляцець | абламаць<br>заляцець |
| Прыставачна-суфіксальны | новы<br>бліскаць | ад + нов + і(ць)<br>па + бліск + ва(ць) | аднавіць<br>пабліскваць |
| Постфіксальны | касіць<br>мыць | касіць + ца<br>мыць + ца | касіцца<br>мыцца |

# Правапіс суфіксаў дзеясловаў

| Умова | Суфікс | Прыклады |
|---|---|---|
| 1-я асоба адзіночнага ліку канчаецца на -ую (-юю): святкую, будую, малюю → | -ава- (-ява-) | у: інфінітыве: святкаваць, будаваць, маляваць; пр. ч.: святкаваў, будаваў, маляваў |
| Перад суфіксам збег зычных з апошнімі л, н, р → | -іва- (-ыва-) | у: інфінітыве: стрымліваць; цяп. ч.: падыгрываю; пр. ч. запэўніваў |
| Перад суфіксам адзін зычны ці збег зычных, але з апошнімі не л, н, р → | -ва- | у: інфінітыве: спісваць; цяп. ч.: выгортваю; пр. ч.: высвістваў |

# Марфалагічны разбор дзеяслова

## Парадак разбору

1. Часціна мовы. Агульнае значэнне.
2. Пачатковая форма.



© ТДА «Аверсэв»

3. Марфалагічныя прыметы:
а) нязменныя: пераходны ці непераходны, зваротны ці незваротны, трыванне, спражэнне;
б) зменныя: лад, лік, час, асоба (калі ёсць), род (калі ёсць).
4. Сінтаксічная роля.

## Узор разбору

Поле пералівалася мяккімі хвалямі залацістага жыта.

*Пералівалася* — дзеяслоў, абазначае дзеянне.

Пачатковая форма *пералівацца*, непераходны, зваротны, залежнага стану, незакончанага трывання, I спражэння, ужыты ў форме абвеснага ладу, адзіночнага ліку, прошлага часу, ніякага роду.

У сказе з'яўляецца выказнікам.

© ТДА «Аверсэв»